# З арыентацыяй на практыку

**На базе Віцебскага дзяржаўнага індустрыяльна-будаўнічага каледжа адбылося пасяджэнне Савета кіраўнікоў устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі Віцебскай вобласці па тэме "Развіццё і ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы каледжа. Арганізацыя практыка-арыентаванага асяроддзя ў адукацыйнай прасторы ўстановы сярэдняй спецыяльнай адукацыі".**

Удзельнікі пасяджэння разгледзелі шэраг актуальных для ўстаноў адукацыі пытанняў, у тым ліку такія, як значэнне прафесійнай кампетэнтнасці і канкурэнтаздольнасці будучага спецыяліста ў перыяд вытворчага навучання, а таксама дадатковая адукацыя дарослых як фактар павышэння канкурэнтаздольнасці і запатрабаванасці спецыяліста на рынку працы. Вопытам работы ў гэтым напрамку падзяліўся калектыў Віцебскага дзяржаўнага індустрыяльна-будаўнічага каледжа. Дырэктар Аляксандр Ласякін пазнаёміў удзельнікаў пасяджэння з матэрыяльна-тэхнічнай базай каледжа, расказаў пра перспектывы яе развіцця. За два апошнія гады сіламі навучэнцаў і майстроў вытворчага навучання былі выкананы работы па мадэрнізацыі ўнутраных памяшканняў і інжынерных сетак сталовай навучальнага корпуса № 1, абсталяваны буфет для харчавання навучэнцаў, выкананы капітальны рамонт медыцынскага пункта, першага і трэцяга паверха вучэбнага корпуса № 1 і бягучы рамонт блокаў інтэрната, праведзена афарбоўка фасадаў інтэрната і вучэбнага корпуса № 2.

Фарміраванне прафесіянала патрабуе станаўлення цэласнай, гуманнай, усебакова развітой асобы. З гэтай мэтай ва ўстанове адукацыі прадугледжана правядзенне заняткаў вытворчага навучання па рабочых прафесіях: муляр, тынкоўшчык, абліцоўшчык-плітачнік, электрагазазваршчык ручной зваркі. Пасля праходжання ўсіх этапаў тэхналагічнага працэсу (ад падрыхтоўчых работ да здачы аб'екта ў эксплуатацыю) у навучэнца складваецца цэласнае ўяўленне аб выкананні будаўнічых работ. Практычныя заняткі дазваляюць максімальна наблізіць вучэбную дзейнасць маладых людзей да іх будучай прафесіі. Работа навучэнцаў па рамонце каледжа ў перыяд вытворчага навучання ўмацоўвае матэрыяльна-тэхнічную базу, паляпшае ўмовы працы работнікаў і ўмовы навучання выхаванцаў, фарміруе культуру працы і адпачынку ўсіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу. Укараненне мадэлі практыка-арыентаванага адукацыйнага асяроддзя ў сістэму прафесійнай падрыхтоўкі навучэнцаў дазваляе выпускнікам каледжа быць канкурэнтаздольнымі на рынку працы.

**Ірына ХЛАПКОВА,**
**метадыст Савета кіраўнікоў устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі Віцебскай вобласці.**